“Я” ў часы катастроф: беларускі аўтафікшн пасля 2020 года

Дыскусія
06.10.2026
18:00-19:30 (Берлін)
19:00-20:30 (Мінск)

Дыскусія адбудзецца на беларускай і англійскай мовах з сінхронным перакладам.

Адной з самых прыкметных з’яў сучаснай літаратуры стаў аўтафікшн – літаратура, якая існуе ў прасторы паміж фактам і вымыслам ды звяртаецца да пытанняў ідэнтычнасці, памяці, траўмы і самога працэсу пісьма. Такія тэксты атрымліваюць прызнанне не толькі сярод шырокай публікі, але і з боку літаратурных інстытуцый – ажно да Нобелеўскай прэміі, якую ў 2022 годзе атрымала Ані Эрно.

Не адстаючы ад сусветных тэндэнцый, беларуская літаратура ў апошнія гады спарадзіла мноства аўтафікцыянальных тэкстаў, асабліва пасля пераломнага 2020 года: толькі сярод лаўрэатаў самай буйной літаратурнай прэміі імя Ежы Гедройца можна налічыць некалькі такіх кніг. У беларускіх выдавецтвах замежжа працягвае выходзіць мноства твораў, якія з розных перспектыў імкнуцца асэнсаваць свет з новымі прасторавымі і часавымі межамі, акрэсленымі масавымі рэпрэсіямі і эміграцыяй, дзе памяць і ідэнтычнасць набываюць новыя вымярэнні. Такую літаратуру культуролаг Максім Жбанкоў прапануе разглядаць як постапакаліптычную літаратуру, або *постфікшн*.

У рамках анлайн-дыскусіі мы абмяркуем, чаму менавіта аўтафікцыя стала прыдатнай формай для асэнсавання беларускага досведу апошніх гадоў. Якім паўстае “я” ў аўтафікшне – і як на яго ўплываюць мова, гендар, сэксуальнасць, досвед міграцыі і прыналежнасць да Беларусі? Як у гэтых тэкстах суадносіцца індывідуальнае “я” і калектыўныя траўмы пакалення, супольнасці, краіны? Ці працягвае постфікшн дыскурс ахвяры, добра знаёмы нам з беларускай літаратуры XX стагоддзя, – або прапануе яму альтэрнатыву? Дзе праходзіць мяжа паміж мемуарамі, дакументальнай прозай і аўтафікцыяй, рэальнасцю і вымыслам – і наколькі гэта наогул важна? Ці сапраўды аўтафікшн і постфікшн – літаратура крызісу? І калі так, што адбудзецца з гэтай літаратурай, калі гістарычная сітуацыя зменіцца?

Мадэрацыя

Яраслава Ананка, Лейпцыгскі ўніверсітэт

Дыскусія

Павел Анціпаў, літаратар, выдавецтва “Мяне няма”, Litradio
Таццяна Заміроўская, літаратарка, журналістка
Ганна Янкута, літаратарка, перакладчыца, літаратуразнаўца

Уводзіны

Сайман Льюіс, Брэменскі ўніверсітэт

Для ўдзелу ў дыскусіі прайдзіце, калі ласка, рэгістрацыю па спасылцы: https://us02web.zoom.us/webinar/register/WN_QoB6JlMkQXmgUa_4UwaQhA

Deutsche Gesellschaft für Osteuropakunde e.V.

ФОРУМ БЕЛАРУСЬ
FORUM BELARUS

CIVIL SOCIETY COOPERATION

Auswärtiges Amt